## ШАЎЛЯЙСКАЯ АПЕРАЦЫЯ
## (5–31 ЛІПЕНЯ 1944)

**Шаўляйская аперацыя** (5–31 ліпеня 1944), наступальная аперацыя войск 1-га Прыбалтыйскага фронту (генерал арміі І. Х. Баграмян); састаўная частка Беларускай аперацыі 1944. Удзельнічалі арміі: 6-я гвардзейская (генерал-палк. І. М. Чысцякоў), 43-я (генерал-лейтэнант А. П. Белабародаў), 2-я гвардзейская (генерал-лейтэнант П. Г. Чанчыбадзе), 51-я (генерал-лейтэнант Я. Р. Крэйзер). Пасля завяршэння Полацкай аперацыі 1944 і выхаду на рубеж Друя, на З ад Варапаева, воз. Нарач войскі 1-га Прыбалтыйскага фронту без аператыўнай паўзы пачалі Шаўляйскую аперацыю. Войскі 6-й гвардзейскай арміі, што перайшлі ў наступленне ў напрамку на Даўгаўпілс, вызвалілі 6 ліпеня г. Браслаў, 8 ліпеня г. п. Відзы, 9 ліпеня г. п. Друя. Наступаўшыя на галоўным напрамку войскі 43-й арміі вызвалілі 5 ліпеня г. Паставы, 7 ліпеня г. Швенчоніс, 9 ліпеня г. п. Лынтупы і г. Уцена і перарэзалі чыгунку Даўгаўпілс – Вільнюс, 18 ліпеня фарсіравалі р. Швянтоі; у выніку ў абароне праціўніка на шаўляйскім напрамку ўтварыўся пралом. 20 ліпеня на гэтым напрамку ў бітву ўведзены 51-я і 2-я гвардзейскія арміі, якія мелі задачу нанесці галоўны ўдар на Шаўляй, з Пд іх наступленне забяспечвала 39-я армія (генерал-палк. І. І. Люднікаў) 3-га Бел. фронту, наступаўшая на Каўнас. Злучэнні 51-й арміі 22 ліпеня авалодалі г. Панявежыс і разам з часцямі 3-га гвардз. механізаванага корпуса 27 ліпеня – г. Шаўляй (10 злучэнняў і часцей атрымалі ганаровыя найменні «Шаўляйскіх»). Часці 6-й гвардзейскай арміі разам з часцямі 4-й ударнай арміі 2-га Прыбалтыйскага фронту 27 ліпеня вызвалілі Даўгаўпілс. Пасля гэтага войскі 1-га Прыбалтыйскага фронту, выконваючы ўказанні Стаўкі Вярхоўнага Галоўнакамандавання, разгарнулі наступленне галоўнымі сіламі на Рыгу, левым крылом на Клайпеду. Часці 3-га гвардзейскага механізаванага корпуса разам з войскамі 51-й арміі вызвалілі г. Елгава і 31 ліпеня выйшлі да Рыжскага заліва. У выніку Шаўляйскай аперацыі савецкія войскі вызвалілі часткі тэрыторыі Браслаўскага і Пастаўскага раёнаў БССР, нанеслі паражэнне праціўніку на шаўляйскім напрамку, прасунуліся ад 100 да 400 км і вызвалілі значную частку тэрыторыі Літоўскай ССР і Латвійскай ССР, з выхадам да Рыжскага заліва выканалі пастаўленую перад імі мэту – перакрылі шляхі адступлення нямецкай групе армій «Поўнач», адрэзалі яе ад Усходняй Прусіі.

### ЛІТАРАТУРА


1. **В боях** за Прибалтику // Рожденная в боях : боевой путь 71-й гвардейской стрелковой Витебской ордена Ленина, Краснознаменной дивизии / авторы: В. Ф. Егоров [и др.]. – М. : Воениздат, 1986. – С. 144–160.
2. **Операция** «Багратион». Освобождение Белоруссии / авт. коллектив: В. А. Жилин [и др.]. – М. : ОЛМА-ПРЕСС, 2004. – 488 с. – (Архив).
3. **Хлебников, Н. М.** Шяуляйское танковое сражение / Н. М. Хлебников // 1418 дней войны : из воспоминаний о Великой Отечественной / сост.: Е. Н. Цветаев, В. С. Яровиков. – М. : Политиздат, 1990. – С. 436–444.
4. **Шаўляйская** аперацыя 1944 // Беларусь у Вялікай Айчыннай вайне, 1941–1945 : энцыклапедыя / рэдкал.: І. П. Шамякін (гал. рэд.) [і інш.]. – Мн. : БелСЭ імя П. Броўкі, 1990. – С. 636–637.
5. **Шяуляйская** наступательная операция 1-го Прибалтийского фронта // Борьба за Советскую Прибалтику в Великой Отечественной войне, 1941–1945 : в 3 кн. / авт. коллектив: А. П. Бачурин [и др.] ; сост.: К. Л. Орлов, В. К. Подпоринов, А. А. Смирнов. – Рига : Лиесма, 1967. – Кн. 2 : К Балтийскому морю. – С. 60–81.